# *Сесія Цэнтральнага выканаўчага камітэта БССР XI скліканне*

## *11 ліпеня 1935 г.*

**Старшыня**—тав. **А. Г. Чарвякоў.**

**Ззаду стала Прэзідыума распаложаны баявыя чырвоныя сцягі, пры якіх нясуць каравул прадстаўнікі мота-механізаваных часцей. Ордэнаносцы нясуць каравул пры сцягу БССР. Зала паседжанняў перапоўнена членамі ЦВК БССР, прыбыўшымі ў поўным саставе, дэлегацыямі ад УССР, ЗСФСР, УзбССР, Чувашскай рэспублікі, Заходняй вобласці, Маскоўскай вобласці, Ленінградскай вобласці, старымі ўдзельнікамі барацьбы і работы ў БССР і лепшымі ўдарнікамі-дэлегатамі ад ўсіх раёнаў БССР. Роўна ў шэсць гадзін да стала Прэзідыума падыходзяць: тав. М. І. КАЛІНІН, члены ўрада тт. ЧАРВЯКОЎ, ГАЛАДЗЕД, ГІКАЛО, ВАЛКОВІЧ, УБАРЭВІЧ, БЕНЕК і інш., кіраўнікі дэлегацый ад брацкіх рэспублик тт. ВАЙЦЭХОЎСКІ, ШАХСУВАРАЎ, НІКІЦІН, РАКІТАЎ, РУМЯНЦЭЎ і інш. Паяўленне іх на трыбуне сустракаецца доўгімі апладысментамі, якія пераходзяць у авацыю. Музыка грае «Інтэрнацыянал».**

**Чарвякоў** (старшыня).—Таварышы! Працоўныя Совецкай Беларусі сёння праводзяць вялікае народнае свята працоўных, прысвечанае двум важнейшым гістарычным датам: 15-годдзю вызвалення Совецкай Беларусі ад белапольскай акупацыі і ўручэнню Беларускай совецкай соцыялістычнай рэспубліцы—Ўрадам Совецкага Саюза вышэйшай узнагароды—**ордэна Леніна.**

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

Гэтыя дзве гістарычныя даты вельмі цесна звязаны паміж сабой. Барацьба за вызваленне Савецкай Беларусі ад белапольскай акупацыі і самае вызваленне ад гэтай акупацыі далі нашай краіне свабоду і магчымасць вольна будаваць соцыялістычнае грамадства і падрыхтавалі глебу для найвялікшых поспехаў у барацьбе за соцыялізм.

І вось сёння, калі мы праводзім гэтае свята, наша першае слова накіравана да тых, хто аддаў сваё жыццё за вызваленне Совецкай Беларусі, хто загінуў у барацьбе на грамадзянскіх фронтах, хто загінуў за пабудову соцыялістычнага грамадства. **Прапаную** ўшанаваць іх памяць уставаннем. (У с е ў с т а ю ц ь. А р к е с т р в ы к о н в а е ж а л о б н ы м а р ш.)

Узнагароджанне нашай рэспублікі **Ордэнам Леніна** паказвае, што справа, за якую змагаліся і загінулі лепшыя сыны нашай краіны, папала ў дастойныя рукі; гэтыя рукі як след скарысталі заваяванае вызваленне, і сёння мы завяршаем цэлы этап слаўнага, гістарычнага, гераічнага шляху нашай барацьбы за соцыялізм.

Як далёка адышлі працоўныя Совецкай Беларусі ад нядаўняга праклятага мінулага!

Сёння, калі рэспубліка заваявала высокую ўзнагароду Вялікага Совецкага Саюза—**Ордэн Леніна,**—гэтая рэзкая розніца паміж цудоўным сучасным і праклятым нядаўнім мінулым адчуваецца з асаблівай сілай.

Сёння мы маем права яшчэ раз поўным голасам на ўвесь свет заявіць аб тым, што няма больш старой, забітай, беднай, асуджанай на выміранне працоўных мас Беларусі— той Беларусі, якая была калоніяй царызма, праклятай «чартой аседласці» для яўрэйскага насельніцтва.

Ёсць новая Беларусь—Беларуская соцыялістычная совецкая рэспубліка, роўнапраўная і неадрыўная частка Вялікага Саюза совецкіх соцыялістычных рэспублік.

Гэта—Беларусь соцыялістычнай прамысловасці.

Беларусь соцыялістычнай сельскай гаспадаркі.

Беларусь соцыялістычнай культуры.

Беларусь перамагаючага соцыялізма.

Беларусь мільёнаў актыўных і свядомых будаўнікоў социялізма.

Пачуццём пролетарскай гордасці прасякнуты ўсе працоўныя Совецкай Беларусі з прычыны найвялікшых перамог у будаўніцтве социялізма, з якімі мы сустракаем вялікае свята вызвалення

У гэты цудоўны, прыгожы дзень, сэрца кожнага працоўнага нашай дарагой социялістычнай радзімы—Совецкага Саюза—і яе неадрыўнай часткі—Совецкай Беларусі з асаблівай сілай напоўнена пачуццём бязмежнай адданасці справе **Леніна—Сталіна.**

У гэты цудоўны, прыгожы дзень, які займае асобае месца ў гісторыі рэволюцыйнай барацьбы Совецкай Беларусі, наша першая думка, усё наша пачуццё любві і адданасці накіроўваюцца да нашага вялікага і мудрага правадыра, да нашага кіраўніка і друга—да таварыша **Сталіна...** (Б у р н ы я а п л а д ы с м е н т ы. Выкрыкі: «Няхай жыве тав. **Сталін!**» «У р а!» А п л а д ы с м е н т ы. «Няхай жыве ВКП(б)—кіраўнік социялістычнага будаўніцтва! У р а!» А п л а д ы с м е н т ы. А р к е с т р і г р а е «І н т э р н а ц ы я н а л»).

Кожны рабочы, работніца, калгаснік, калгасніца, усе працоўныя Совецкай Беларусі ясна разумеюць, што ўся гісторыя Совецкай Беларусі, яе стварэнне, барацьба за вызваленне, аднаўленне яе зруйнаванай пасля вайны гаспадаркі, социялістычная рэканструкцыя гаспадаркі, пышны росквіт культуры нацыянальнай па форме і социялістычнай па зместу,—што ўсё гэта ёсць вынік кіраўніцтва Компартыі, яе ленінскага ЦК, на чале якога стаіць геніяльны кіраўнік працоўных мас усяго свету таварыш **Сталін.** (Б у р н ы я а п л а д ы с м е н т ы.)

У гэты цудоўны дзень яшчэ больш узмацняецца пачуццё любві і адданасці нашай цудоўнай социялістычнай радзіме—Вялікаму Совецкаму Саюзу, неадрыўную частку якога складае Совецкая Беларусь. Толькі дзякуючы пастаяннай дапамозе і кіраўніцтву з боку Урада Совецкага Саюза, дзякуючы таму, што пролетарыят усяго Совецкага Саюза, і ў асаблівасці рускі пролетарыят, своечасова пры-

шоў на дапамогу абяздоленаму, змучанаму, пакутваўшаму пад гнётам акупанта, працоўнаму народу Беларусі, стала магчымым вызваленне ад акупацыі і самае існаванне Савецкай Беларусі.

Таму мы з пачуццём глыбокай радасці вітаем сёння аднаго з лепшых сыноў нашай партыі, блізкіх саратнікаў Леніна і Сталіна, выдатнейшага рускага пралетарыя, усесаюзнага старасту—**Міхаіла Іванавіча Калініна** (шумная авацыя, крыкі «ура», аркестр)—і ў асобе **М. І. Калініна** ўвесь Вялікі Совецкі Саюз і яго Рабоча-сялянскі ўрад на чале з старшынёй Совета народных камісараў **В. М. Молатавым** (ш у м н ы я а в а ц ы і, к р ы к і «у р а»).

Працоўныя Совецкай Беларусі знайшлі сваю дарагую і любімую соцыялістычную бацькаўшчыну толькі дзякуючы таму, што Чырвоная армія, ажыццявіўшы найвялікшы стратэгічны план Леніна—Сталіна, пад камандаваннем жалезнага палкаводца **К. Е. Варашылава** (шумныя авацыі, крыкі «ура») разграміла белапалякаў на Украінскім фронце, прадрашыла далейшы разгром і адыход акупантаў на Заходнім фронце. Гэты разгром быў ажыццёўлен гераічнымі арміямі Заходняга фронта пры падтрымцы паўстаўшага працоўнага народу, арганізаваўшага масавы партызанскі рух і паўстанні ў тылу белапалякаў.

Таму мы ўсе навучыліся цаніць вялікае значэнне арганізаванай Рабоча-сялянскай Чырвонай арміі, мы горача паважаем і любім яе слаўных камандзіраў, таленавітых палкаводцаў.

З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы